©БрДУ

# ВОБРАЗ БАЛОТА ЯК ЧЫННІК ПРЫРОДНА-ЛАНДШАФТНАГА КОДА БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ

***А. А. ВАСІЛЬЧУК,* І. А. ШВЕД**

The article considers Belarusian popular notions about the swamp. The analysis of this image in folklore reputed folklore and ethnographic sources

Ключавыя словы: вобраз, сімволіка, код, балота

Неабходнасць вывучэння і захавання духоўных набыткаў нашых продкаў, нераспрацаванасць шырокага кола праблем знакавай арганізацыі свету, адным з галоўных інструментаў якой выступае прыродна-ландшафтны код, накапленне адпаведнага багатага фактычнага матэрыялу, які чакае грунтоўнага сістэмнага вывучэння паводле новых напрацовак у галіне фалькларыстыкі, семіётыкі, этналінгвістыкі, культуралогіі і іншых гуманітарных навук, добрая захаванасць архаічных прыродна-ландшафтных вобразаў і жывучасць звязаных з імі міфапаэтычных уяўленняў (што выразна адбілася ў розных відах мастацтва), неабходнасць паглыблення разумення агульнаславянскага пласта ўяўленняў пра розныя аспекты светабудовы, зафіксаваных у прыродна-ландшафтным кодзе, вызначаюць актуальнасць тэмы прапанаванай працы.

Прыродна-ландшафтны код трактуецца намі як сродак традыцыйнага мадэліравання свету на аснове яго пазнання, ацэнкі і апісання праз прыродна-ландшафтныя сімвалы, якія ўтвараюць сістэму парадыгматычных і сінтагматычных адносін.

Вывучэнне паасобных прыродна-ландшафтных сімвалаў па-за рамкамі кода, у межах якога яны функцыянуюць, і часта па-за кантэкстам традыцыйнай культуры не дазваляла даследаванне ўсебакова раскрыць сутнасць сімвалаў міфапаэтычнага мыслення. Перанос акцэнтаў з эмпірыка-канстатуючага апісання фальклорнай вобразнасці, разгляду асобных сімвалаў фальклору ў рамках літаратурнай эстэтыкі на комплекснае даследаванне традыцыйнай карціны свету і сродкаў яе знакавай фіксацыі, у тым ліку прыродна-ландшафтных сімвалаў, актуалізуе эўрыстычную каштоўнасць сістэмнага падыходу. У дачыненні да вывучэння прыродна-ландшафтнага кода такі падыход разумеецца як ідэнтыфікацыя неабходнага і дастатковага комплексу характарыстык (якія ў сукупнасці вызначаюць існаванне прыродна-ландшафтнага кода як цэласнага феномена) і рэканструкцыя працэсу і вынікаў семантызацыі прыродна-ладшафтных аб’ектаў.

Адным з высокасеміятызаваных аб’ектаў з’яўляецца балота – вызначальны элемент прыродна-ландшафтнага кода беларускага традыцыйнага фальклору. Больш за тое, як адзначае І. Чарота, балота нясе ў свядомасці ідэаграму «этнас у сусвеце». «Гэта не толькі выява, але і каларыт, і рытм, і настрой, паводле якіх можна ідэнтыфікаваць дух насельнікаў увасобленай прасторы». І далей: «…пайшоўшы ад балотнага архетыпа, неабходна імкнуцца да асэнсавання цэласнай тыпалогіі беларускага светаадлюстравання…» [1, с. 107, 142].

У шэрагу фальклорных тэкстаў з этыялагічнымі матывамі балота маркіруецца як прастора, якая існавала яшчэ перад касмізацыяй свету («Гэтых рэчак [Нёмана і Лашы. – І.Ш.] яшчэ не было. І ў тым месцы, дзе яны цяпер выцякаюць, стаяў у балоце стары корч…» [3, с. 559]). Як увасабленне хаосу, балота было аднесена да чужога свету і звязана сваім генезісам і функцыянальнасцю з дэманічнымі істотамі. «Балоты да ўсялякую тхланню да нетру зрабіў чорт. Ён падгледзяў, што Бог сее зямлю, от ён схапіў трохі зямлі да й схаваў яе ў горло. Азірнуўся Бог да й пытае, што ён есь. Чорт, каб атперціса, хучэй праглынуў тую землю. Толькі ён тое зрабіў, як у ём зямля пачала расці. Бачыць чорт, што зямля расперла яго, от ён давай рыгаць. От дзе толькі чорт рыгнуў, там і зрабіласо балото да такая нетра, што там і да тых час толькі й жывуць чэрці» [4, с. 50].

У этыялагічных легендах тлумачыцца, чаму рэкі (напрыклад, Сож) цякуць махамі-балотамі [3, с. 559]. Самі балоты могуць узнікаць з заклятых рэк ці азёр. Так, балота каля Клейнікаў нібыта зрабілася з ракі, у якой загінула дзяўчына-прыгажуня. Засмучаная маці дзяўчыны кінула ў ваду авечае руно са словамі: «Згінь, рэчка! Не будзе цябе столькі гадоў, колькі ёсць валасоў воўны на авечым руне». На месцы рэчкі з’явілася балота [5, с.171]. Паводле іншай легенды, заклятаму ў балота возеру можна вярнуць былы выгляд, выканаўшы цяжкае заданне: «Няхай знойдзецца дзяціна сямі год, праедзе па балоту на кабыле трох год і адшукае тое месца, дзе патануў сын [чараўніцы, якая закляла возера]. На

месцы тым выраслі тры чараціны (тры кусты чароту), трэба іх таму дзяціне вырваць і, не азіраючыся, увезці прэч» [5, с. 172]. У балота Бог можа ператварыць і палі, каб не даць магчымасці знайсці людзям закапаны скарб багацея. Тыя, хто пераступаў мяжу, за якой пачыналася балота, гінулі [5, с. 173].

Касмаганічная сімволіка балота звязана і з яго рэальнымі ўласцівасцямі – гэта беспарадкавая сумесь зямлі і вады, першасных элементаў, з якіх утвараўся будучы Космас. Таму балота – улюблёнае месца бытавання розных нячысцікаў, якія пераймаюць функцыі антаганіста Бога ў акце стварэння. Але сярод гэтых нячысцікаў таксама назіраецца пэўная спецыялізацыя [6, с. 41]. Менавіта ў балоце нячысцікі ў поўнай меры могуць рэалізаваць сваю магічную сілу. Вераць, што ў балоце лакалізуецца Кадук, які топіць людзей, коней і да т.п. Пастаяннымі жыхарамі балота з'яўляюцца бабка балотавая, бабка чаротавая. З ёю людзі ўступаюць у абменныя, роднасныя стасункі – братаюцца, сватаюцца, каб пазбавіцца ад начніц [8, с. 341]. У прысушцы ў гразкіх балотах знаходзіцца акаянная сіла [8, с. 376]. На балоце, паводле палескіх вераванняў, круціцца чорт, якога немагчыма злавіць. Ва ўстойлівых выразах балота трывала залічана да дэманічных прыстанішчаў. Звяртае на сябе ўвагу рэалізацыя матыву застойнасці, нерухомасці таго балота, у якім водзяцца чэрці: «У ціхім балоця чэрці водзюцца» [2, с. 106]. Асноўны змест парэмій з кампанентам балота мае негатыўную ацэнку. Тое ж звычайна характэрна і для былічак, казак.

З неадназначнасцю ўяўленняў пра паходжане балота можна паставіць і адсутнасць адзінай аксіялагізацыі гэтага вобраза. Балота сінтэзуе разбуральныя і крэатыўныя ўласцівасці і выступае ў комплексе як з негатыўна, так і пазітыўна асэнсаванымі фрагментамі светабудовы – напрыклад, у восеньскіх песнях балота згадваецца разам са станоўча ацэненымі вобразамі крыніц, лугоў, вадзіцы. У веснавой песні па мхах, па балотах, па гнілых калодах разліваецца ціхенькі Дунайка. У песнях з балота, як і з крыніц, выходзяць рэкі. У замовах з балот выцякае царыца-вадзіца, якая абмывае хворага чалавека; бяжыць па балотах ачысціцельніца наша [8, с. 47]. У такіх матывах увасабляецца пазітыўны аспект вобраза балота і падкрэсліваюцца яго творчыя патэнцыі. З балот таксама паднімаюцца адмысловыя хмаркі, у балоце ж яны і гінуць: «Восенню пад дажджавымі хмарамі падчас скоранька бягуць маленькія хмаркі над самымі хвойкамі так нізка, што другі раз каторая і зачэпіцца за штык…. Етыя хмаркі ў нас завуцца пераездэжыя свахі. Знахары кажуць, што яны паднімаюцца з балота да там і гінуць» [9, с. 15]. З зараджэннем жыцця балота ўскосна звязана ў абрадавых песнях – напрыклад, у юр'еўскай: «Ой, хадзіла пава па балоці, // Да ой, Юрай, і адно, па балоці, // Да збірала пава трасцяйку, // Завівала пава гняздзяйко. // Ой, сядзела пава тры нядзелькі, // Высядзела пава тры паненкі. // Першая паненка – Галячка, // Другая паненка – Танячка, // Трэцяя паненка – Ірачка» [6, с. 53]. Балота можа ацэньвацца пазітыўна, надзяляцца атрыбутамі з такой самай аксіялагізацыяй у шэрагу іншых песенных тэкстаў. Так, у вясельных, а таксама восеньскіх песнях яно лакалізуецца каля хаты, прымыкае да антрапагеннага асяродка, называецца балоцейкам, характарызуецца як круглае, малое. Станоўчая ацэнка балота выразна дэманструецца ў яго лакатыўнай сувязі з кветкамі, якія маюць рытуальнае значэнне. У вясельных песнях на балоце ззяюць краскі, з якіх дзяўчаты звіваюць вянкі. Па кругленькім балоцечку гуляе малодачка, спявае і засявае красу, якая павінна там разрасціся. Да гэтай жа тэмы маюць адносіны матывы, дзе хлопец ходзіць па сухім балоце, кліча дзяўчыну («Хаджу, хаджу па балоту – // Балоцейка суха. // Выйдзі, выйдзі на вуліцу, // Мая шчабятуха» [10, с. 133]), а таксама просіць: «– Цераз рэчаньку, цераз балота // Падай ручэньку, маё золата» [10, с. 108].

У шэрагу вясельных песень балота выяўляецца як ідэальны локус для гуляння коней, жыцця сям'і ласёў. Балота, семантычна і функцыянальна блізкае дубовай калодзе, выступае таксама месцам знаходжання бабра (яго вобраз надзелены эратычна-шлюбнай сімволікай). Са сваім, а значыць пазітыўна асэнсаваным, светам балота карэлюе ў парэміях тыпу «Гэта кулік вялікага балота», «Кожны кулік на сваім балоце вялік», «Жыве кулік, дзе прывык, і кожны сваё балота хваліць», «Кожны кулік сваё балота хваля» [2, с. 55]. Акрамя куліка з балотам звязаны бусел, пава, цяцера, жораў, чапля, бугай. З вобразам балота рэгулярна асацыіруецца баран. У народнай свядомасці ўстойліва замацавалася асацыятыўная сувязь балота з класам гадаў. Атрыбутам балота можа выступаць воўк.

На балоце лакалізуюцца розныя расліны. Паводле беларускіх вераванняў, змеі выходзяць са сваіх багністых логаваў на другі дзень Купалля, таму што ў гэты час па балотах цвіце ненавісная ім расліна, вядомая пад назвай Парыла. На балоце растуць ягады, якія ў вусна-паэтычных тэкстах розных жанраў збіраюць дзяўчаты, жанчыны. Важна, што збіранне ягад на балоце нярэдка карэлюе з матывам сіроцтва: «Ой, балота-балоцечка, // Там хадзілі сіротачкі // Да збіралі ягадачкі...» [11, с. 27]. У казцы «Дуб Дарахвей» новая жонка загадвае дзеду адвесці яго дзяцей у лес на пагібель, ён прыводзіць іх у балота і пакідае збіраць ягады. На балоце расце лаза, якую выкарыстоўвалі ў гаспадарцы. Так, Лознічамі назвалі балота, зарослае густой лазой, з якой дралі лыка, плялі лапці (Лелікава

Кобрынскага р-на). На балоце таксама расце трава, якую нарыхтоўваюць для свойскай жывёлы. Беларусы лічылі, што снегавую дарожку Бог сцеле па полі для таго, каб людзям добра было вазіць сена з балота [9, с. 20].

У загадках балота таксама выяўляецца як значны для чалавечай дзейнасці элемент ландшафту, цвёрая паверхня, па якой можна рухацца («Па мне паўгода ходзяць, паўгода ездзяць» [12, с. 31]). Разам з тым балота прадстаўляецца як субстанцыя, утвораная з сумесі зямлі і зямной вільгаці (гл. загадку пра балота: «Ні мора, ні зямля, караблі не плаваюць, бо нельга» [12, с. 31]). Адзначаная асаблівасць балота матывуе яго семантызацыю як хаосу. У вусна-паэтычных творах розных жанраў балоты характарызуюцца як глухія, глыбокія, дзікія, мокрыя, гразкія («А балота ў нас гразкія ды глыбокія, так што можна саўсім праваліцца ў такую тхлань, што й не вылезеш» [4, с. 245]). Балоты таксама могуць выяўляцца як ржавыя, бурыя, шэрыя, сухія. У загадцы пра балота гаворыцца, што яно дрыжыць [12, с. 140].

У загадках, казках балота разам з іншымі прыродна-ландшафтнымі аб'ектамі ўтварае Сусвет («Рыкнуў вол на сем сёл, на сем рэчак, на сем печак, на тысячу балот»; «Раўнуў вол на сто гор, за дзесяць балот» [12, с. 37]; «Ехалі яны, ехалі і даехалі да канца мора. Прывязалі карабель да куста, дзе была зямля пустая, і пайшлі па лясах і балотах…» [13, с. 188]). Балота ўваходзіць у групу аб'ектаў, якія складаюць маргінальную вобласць: «Каціўся вугаль, каціўся, // Праз тры полі, чатыры, // Праз пятае балота // Ў свякроўчыны вароты» [7, с. 356]. Такімі супастаўляльнымі з балотам аб'ектамі, акрамя поля, з'яўляюцца лог, сіняе мора, бор (пра бязладную гаспадарку і нядбайнага гаспадара гаварылі: «Двор па бор, вароты па балота» [2, с. 36]). У вясельных песнях балота разам са шчырым борам, сасоннем надзяляецца адмежавальнай функцыяй. Маладой жанчынне, каб трапіць у родны дом, неабходна знішчыць гэтыя сімвалічна аднапарадкавыя аб'екты. Аналагічная семантыка балота характэрная і для казак, дзе герой, ідучы са «свайго» свету, праходзіць паўз берагі, балоты і знаходзіць яблыню рагатую, кашлатую, ад пладоў якой у людзей вырастаюць рогі [3, с. 476]. У казцы «Бабіна дачка і дзедава дачка», калі апошнюю пакідаюць у лясной хатцы, дзяўчына з надыходам вечара кліча: «Хто ў лесе, хто ў балоце, хадзі ка мне начаваць». На кліч адгукаецца Мядзведзь [2, с. 446]. Перыферыйнае становішча балота займае ў паданнях, дзе яно акаляе гару, на якой стаіць замак ці іншы аб'ект: «Горка гэтая абкружана гразкім балотцам, а наверсе яе, на самым шчыце, ляжыць вялізарная каменная труна» [5, с. 43]. У вераваннях пра заклятыя скарбы апошнія могуць лакалізавацца як у балоце, так і ў лесе, полі.

У замовах, каляндарна-абрадавых песнях, вераваннях балота разам з падобна семантызаванымі рэаліямі звязваецца з крызіснымі сітуацыямі, выступае дзейсным каналам сувязі з іншасветам, увасабляе той свет; атаясамліваецца з пачатковым хаатычным станам першаматэрыі і, адпаведна, надзяляецца творчай патэнцыяй. Такімі вобразамі, якія ўтвараюць калекцыю з балотам, з'яўляюцца лугі, ніцыя лозы, шары бары, цёмныя лясы, мох, шырокае поле, сухія лясы; калючая груша, кусты, лыкадзёры, гніцелі, сыр-бор. Глухое балота – увасабленне безжыццёвасці, своеасаблівы антысвет, але разам з тым – сакральны локус, дзе ў замовах адбываецца ачышчэнне чалавечага свету ад хвароб, злога чаравання і іншых бед. Намагаючыся выгнаць з хворага чалавека шкодных духаў, выкарыстоўвалі адно з прывычных асяродкаў іх лакалізацыі – балота. Туды адсылаюцца ўрокі, скулы, ляк, упуд, сцень, нуда, рожа, зубны боль, ліхаманка (Ірадавы дочкі), а таксама дамавы, няшчасны лясны хазяін, чараўнік і яго злая хвароба. Сарокі і вароны адносяць урокі на глухія балоты (=у антысвет), дзе птушкі не пяюць, гнёды не ўюць, дзяцей не маюць.

Вобраз балота вельмі шырока ўжываецца ў любоўных замовах. Да прыкладу: "Дым-дымище, иде з печи жаром, з целушки паром, з бухних витров, з бухних витров. Ви пойдит полетить в восточну сторону. Там есть болото. В том болоти сидять з немилими, з некультивими, з одворотеме. У руках держать по дубовой тросточки, ходять по железной тросточки, никогда вони не сходяться. Як зейдуться, зоймуться, ругаються, з волося тыскаються, друг друга в глаза харкаються. Щоб рабобожому и рабобожой … николи не сходитися. А як зойдуться, займутся, деруться, ругаються, за волося таскаються, друг в друга в глаза харкалис и плодовие речи не говорили" [ПА, в. Вышэвічы Радомыльшскі р-н].

З уяўленнем пра іншасветнасць і аддаленасць балота, а таксама возера звязаны шырока распаўсюджаныя звычаі пакідаць у гэтых локусах розныя рэаліі, такім чынам пазбаўляючыся іх. У балоце як хаосе, адкуль усё выходзіць і куды ўсё вяртаецца, яны знікаюць (гл. вышэй пра хмаркі, якія з'яўляюцца з балота і знікаюць у ім). Дарэчы, у якасці найбольш тыповых спосабаў знішчэння рытуальнага аб'екта, які сімвалізаваў ведзьму, у палескай зоне выступаюць наступныя: спальванне, сплаўленне па вадзе, выкідванне ў канавы, ямы, балота, закідванне на дах хаты, на дрэва і да т. п. [14, с. 250]. У абрадзе выклікання дажджу знятыя вароты кідалі ў названыя мясціны. У гэтым жа радзе

стаіць тлумачэнне звычаю адносіць у глыбокае балота забітую змяю: калі яе закапаць у ворную ці сенакосную зямлю, там не стане расці ні хлеб, ні трава [15, с. 200]. Паводле этнаграфічных, археалагічных звестак, балота – месца ахвярапрынашэнняў. Так, у 1963 г. у балоце блізу в. Капланавічы Клецкага р-на знойдзена драўлянае рала ранняга жалезнага веку. Такія знаходкі ў балоце вядомыя ў Скандынавіі, Германіі. Знаходкі ралаў у балоце даследчыкі тлумачаць як ахвяраванні сілам вады пасля вясенняга ворыва дзеля атрымання добрага ўраджаю [16, с. 41].

На Беларусі існаваў звычай адносіць на балота і выкідваць "нячыстыя" рэчы (адзенне памерлага, смецце). У некаторых раёнах балота было месцам пахавання "нячыстага" нябожчыка – самагубцы, так як лічылі, што балота – месца знаходжання нячыстай сілы. Напрыклад: «Кажуть, нэчыста сила у балоти. Шоў чоловэк, Гусак дразнили його. Пришоў у Барбароў, зашоў у цэркаў, да зашоў у карчму, да добро выпиў. Што после идэ, а чэрти за його да чэрэз воду його пэрэнэсли, на купину палажыли (кочка на болоте). Його розули, чоботы павэсили, анучэчки павэсили. А йон спыть. Да ему коньскага кала прынесли таки булки – його угашчають. Да тую воду нальють у чэрэпок, а йон думае – то пива стаить. Праснуўса йон: пэрэд ним коньский кал, чэрэпок воды. Да стаў кричать, стаў гукать, да пришли пэрэвэзли його – бо глыбоко – утонешь. Заракнуўса: сколька буду жыть, не буду пить» [ПА, в. Барбараў Мазырскі р-н].

Вядома легенда, згодна якой Бог пакараў чалавека за тое, што той не выкінуў мяшок з «гадамі» ў балота: «Шёв дедок и дал мешок человеку нести и сказал: «Занести этого мешка ў болотэ и выкинь, но не развязывай», а человек развязал, ўсё и расползлось. «Теперь ты будешь усю жизнь буслом и будешь собирать весь гад на болоте», – сказал дедок» [ПА, в. Барбараў Мазырскі р-н]; «Колысь Бог казав, шчо позбыраты ту всю звирыну: и гадюкы и жабы, то вин (Бог) зибрав всэ в мишок и на, втопы. Тилько мишка нэ позвьезуй и нэ дывыси. И занэсы його, втопы. То нэ будэ тойи паскуды. То дийшов до болота и став дывытыся. А воно то як з мишка пулизло и розлизлося. То й Бог розсэрдывся и пыхонув його в болото, то вин покы обмазався. – То ты будэш цилый вик збыраты тое. Завшы по булоти ходыть тай збырае» [ПА, в. Забуж'е Любамльскі р-н].

У заключэнне адзначым, што тыповай і пераважнай аксіялагізацыяй вобраза балота, які нясе сему смерці, ліха, з'яўляецца негатыўная. Гэта абумоўлена рэальнымі і прыпісанымі характарыстыкамі балота, яго міфалагічным судачыненнем з іншасветам і дэманічнымі істотамі. Разам з тым для беларускай міфапаэтычнай традыцыі актуальна карэляцыя вобраза балота з жыццядайным пачаткам і пазітыўна ацэненымі вобразамі. Ва ўсякім выпадку шэраг твораў указвае на тое, што балота з яго крэатыўнымі патэнцыямі магло мысліцца ў якасці першапачатковага стану свету і жыццёвай субстанцыі ці пазітыўнага элемента касмічнай сістэмы. Вобраз балота выяўляе адмысловае адзінства процілегласцей: балота як хаос усё раскрывае, нараджае, і ў той жа час усё паглынае, усё нівеліруе, хавае ўнутр. Канструктыўныя магчымасці і хібы, такім чынам, спалучаюцца. Апошнія становяцца локусам дэструктыўных тэндэнцый. Пашырэнне базы даных па гэтым пытанні магчыма за кошт матэрыялаў, якія датычаць душ памерлых, міфалагізаваных звяроў, птушак, раслін, заклятых скарбаў, агню і інш.

**Літаратура**


1. *Чарота, І.А.* Пошук спрадвечнай існасці : Беларуская літаратура XX стагоддзя ў працэсах нацыянальнага самавызначэння / І.А. Чарота. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 159 с.
2. *Аксамітаў, А.* Прыказкі і прымаўкі : Тлумачальны слоўнік беларускіх прыказак і прымавак з архіваў, кафедр, збораў, рэд. выд. XIX і XX стст / А. Аксамітаў. – Мінск : Беларуская навука, 2000. – 320 с.
3. Беларускі фальклор: хрэстаматыя. – 4-е выд., перапрац. / Склад. К.П. Кабашнікаў і інш.– Мінск : Выш. шк., 1996. – 856 с.
4. *Сержпутоўскі, А.К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
5. Дрэва кахання : Легенды, паданні, сказы / Склад. А.І. Гурскі. – Мінск : Юнацтва, 1993. – 222 с.
6. *Варфаламеева, Т.Б.* Песні Беларускага Панямоння / Т.Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 287 с.
7. Веснавыя песні / Склад. Г.А. Барташэвіч, Л.М. Салавей, В.І. Ялатаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 607 с.
8. Замовы / Уклад. Г.А. Барташэвіч. – Мінск : Беларуская навука, 2000. – 597 с.
9. *Pietkiewicz, Cz.* Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego. Materiaiy etnograficzne / Cz. Pietkiewicz. – Warszawa, 1938.
10. Песні пра каханне / Склад. І.К. Цішчанкі, С.Г. Нісневіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 616 с.
11. Лірычныя песні / Уклад. і рэд. Н.С. Гілевіча. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1976. – 464 с.
12. Загадкі / Склад. М.Я. Грынблат, А.І. Гурскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 448 с.
13. Чарадзейныя казкі : У 2 ч. / Склад. К.П. Кабашнікаў, Г.А. Барташэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973 – 1978. – Ч. 2. – 1978. – 696 с.
14. *Виноградова, Л.Н.* Народная демонология и мифо-ритуальная традиция славян / Л.Н. Виноградова. – Москва : Индрик, 2000. – 432 с.
15. *Никифоровский, Н.Я.* Нечистики. Свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе / Н.Я. Никифоровский. – Вильна, 1907. – 103 с.

16. *Дучыц, Л.* Балота / Л. Дучыц, У. Лобач, С. Санько // Беларуская міфалогія: энцыклапед. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Минск : Беларусь, 2004. – С.41 – 42.